Вольная Беларусь

Цэна асобнага № 25 кап.

Умовы падпіскі на 1917 год.

За 1 м	За 2 м	За 3 м	За 4 м	За 5 м	За 6 м	За 7 м	За 8 м	За 9 м
1 р.	2 р.	3 р.	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.

Надпіска прымаецца толькі с 1-го чысла кожнаго месяца.

Перамена адрэсу 50 кап. Пры зьмені адрэсу конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска перапісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ні будуць.

На ліставанне, перасылку рукапісау і іншыя адказы—павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, эконамічная і літэратурная.

ГОД ВЫДАННЯ I.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захарауск. 18.

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 рад. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы—1 руб. за 3 радкі за адзін раз.

№ 34 | 1917 г. | Пятніца 15 сьнежня | 1917 г. | № 34

Фэдэрацыя і конфэдэрацыя.

Самае глаунае правіло дэмократызму: *урад, каторы ні ты сабе паставіу і каторы ні пад тваім дагдядам* —гэта твой вораг; *ен ні заслугуе твае веры і ніякай законнай уласці над табою ні мае.* Дзеля гэтаго самаго, каліб Расія ні была фэдэрацыей, дык у ей ніколі ні будзе дэмократызму, супакою, парадку, а будзе толькі барацьба, поустанне, уціск, калатня і сваволле.

Якая ж розніца паміж конфэдэрацыей і фэдэрацыей?

Конфэдэрацыя—гэта найсвабоднейшая форма фэдэрацыі. У конфэдэрацыі Цэнтральны Урад кіруе толькі нікаторымі агульна-гасуд. справамі, і усе яго пастановы могуць апратэставаць урады і соймы (Рады) асобных частак конфэдэрацыі; ва усіх важных справах, напрыклад, каб пачаць вайну,—вымагаецца згода усіх частак конфэдэрацыі, і каліб якая нібудзь частка ні лічыла патрэбным ваеваць, дык яна можэ ні ваеваць зусім.

Адным словам, у конфэдэрацыі нельга прымушаць ніводную з яе частак рабіць тое, чаго народ яе ні хочэ, нават тады, калі усе яе хаурусвікі хочуць гэтаго. У конфэдэрацыі кожны яе супольнік мае усю сваю сувэрэнную (верхоуную) уласьць і мае абавязак рабіць толькі тое што ен добрахвотна узяу на сябе і што знайходзіцца у хаурусвай умові.

У звычайнай фэдэрацыі Цэнтральны Урад мае вялікшую уласьць; у такой фэдэрацыі апрач таго, есьціка супольны парлямэнт, законы якога абавязковы для усіх. Уласьць такога парлямэнту меньшая, як у ні фэдэратыунай дэмократычнай рэспублікі, у каторай парлямэнт пастанауляе усе справы без вынятку, дзе парлямэнт—гэта шмат—галовы цар, але трэба ведаць, што у звычайнай фэдэрацыі парлямэнт с часам здабывае вялікую сілу і пачынае ціснуць хаурусвыя краі. Кажучы карацей, у конфэдэрацыі усе пастановы прыймаюцца у адзін голас усімі хаурусными краямі, такім чынам захоуваюць усю сваю волю і нізалежнасць, а у звычайнай фэдэрацыі вельмі часта меньшасць павінна карыцца большасьці.

Вось чаму у гасударстві, у склад катораго уходзіць шмат нацыяу, конфэдэрацыя забезпечае згоду, супакой і парадак паміж нацыямі лепш, як у звычайнай фэдэрацыі. Каб завесьці фэдэрацыю, ці конфэдэрацыю, народы павінны свабодна згаварыцца паміж сабою, як роуныя з роуньмі. Дзеля гэтаго, усе народы пасылаюць у адно мейсцо сваіх прэдстаувікау, каторыя усе справы пастанауляюць аднастайне: калі варункі умовау ні выгодны якому нібудзь народу, дык ен можэ ні прыстаць да фэдэрацыі і шукаць другіх хаурусвікау.

Поглядзімо цяперака, ці на Усерасійскім Устаноучым Соймі можна будзе завесьці фэдэрацыю.

Адказ на гэта адзін—ні можна будзе.

На Усерасійскім Устаноучым Соймі усе будзе пастаноуляцца перавагаю галасоу; і вось можэ зрабіцца гэтак, што якая нібудзь нацыя, напрыклад, Беларусь, змушана будзе карыцца пастанові другіх нацыяу і нават тады, калі гэта пастанова будзе для яе нівыгоднай, а можэ і шкоднай; яе могуць змусіць, напрыклад, увайсьці у нявольны хаурус, фэдэрацыю, па вельмі нівыгодных варунках.

Ведама, такі прымусовы хаурус на нівыгадных варунках ні меу-бы ніякай маральнай сілы і, улучыушы зручны момэнт, Беларусь пастаралася б высвабадзіцца з гэтаго хаурусу, У такой фэдэрацыі панавала б ніздавольненне, падазронасць і яна б ні дала нічога, апрач благога.

Пытанне аб хаурусі кожная нацыя павінна разобраць нізалежна, вольна, у сябе дома, а посьля наслаць сваіх прэдстаунікау згаварыцца с прэдстаунікамі другіх нацыяу, і вось гэтыя прэдстаунікі напішуць конфэдэратыуную умову, каторую нацыі праз свае Рады ці Устаноучыя соймы павінны зацьвердзіць, і тады толькі будзе абвешчана Расійская Конфэдэрацыя.

А. Б.

Свята на Беларусі.

(Адчыненне Усебеларускаго зьезду 7-го лістападу а 8-й гадз. у вечары).

Беларускі народ—гэта той волат-асілак, на некольки сотак гадоу быушы зачарован чараунідамі. Ен спау у сваіх лясох, абвеяных казкамі; ен спау у сваіх палех, апавітых сумнымі песьнямі жнеяу і ратаеу.

Спау ен моцным, ніпрабудным сном, а тут плялі над ім свае густыя павуціны цеткі-чарауніцы. Яны абкурывалі яго сваімі зеллямі і нашэптывалі у самыя вушы свае цемныя замовы.

А завуцца эгтыя цеткі—Масква і Варшава.

Часам да яго вуха далетало гуканне: —«Уставай! ачніся!»

Гэта яго родная сястра Украіна гукала яму.

—«Досыць спаць, ідзі да сонейка...» —казала яна.

Беларус спау,—спау цяжкім летаргічным сном.

Але вось кончыліся чары, страцілі сілу замовы.

Закруціу, зашумеу вецер-віхор над густым шчыр-борам. Беларус-волат ачнууся і давай азірацца па бакох.

Заніпакойліся прагавітыя цеткі і давай угаварываць-упрашаць, ціхамірыць яго:

— «Ляжы, спі, як спау дагэтуль, у мягкім моху, у цяпечку... куды табе ісьці у сьвет? Там сонцо вочы сьлепіць... там віхры на волі гуляюць... шчэ у вір зацягнуць там, злійся-злучайся з намі!» Зноу у духоуную ніволю хацелі яго зацягнуць.

Але Беларус скінуу с сябе ланцугі гэтых чарау, і рушыу уперад. Ен задумау адбудаваць сваю нацыянальную будоулю, тую будыніну, першыя цэгліны якой паложэны за апошнія сто гадоу лепшымі сынамі Бацькаушчыны, сьвядомымі піанэрамі беларускаго руху, ахвяравaушых жыцце свае за свой родны край, за сваіх гарапашных братоу і бацькоу ратаеу,

І беларуская нацыянальная будыніна, абгорнутая густымі хмарамі, за апошні час волі усе рэльефней і выдатней пачала вызначацца пад пашым родным небам.

Вялікая Беларуская Рада, злучна з Вайсковай Беларускай Радай, склікала Усебеларускі Зьезд у сэрцы Беларусі, Мінску, дзе калісьці цекла і хвалевалася рэчка Неміга, асьпеваная слауным Боянам у хвальным «Слові о полку Ігораві» З усіх глухіх куткоу нашай роднай старонкі, з усей Расіі і з усіх фронтау прышлі беларусы, высланыя народам.

Побач с беларусамі інтэлігэнтамі, стаяць з усіх беларускіх воласьцяу і с фронтау барадатыя «дзядзькі», селяне у кажухах, у сьвітках, у шэрых шынэлях, з клункамі за плячыма

Мінскі гарадзкі тэатр перапоуняны.

Хто так сабе зацікаулены, хто у душы зварухнууся, а хто полымем гарыць. І кожнае слово яго полымя, і увесь ен палае каханнем да роднай абездоленай Краіны свае.

Есьць некольки і з вядомых ворагау беларускай справы. Яны стараюцца шкодзіць як-мага і чым-мага. Пераодзетыя у селянскія кажушкі, яны прыйшлі, як на маскарад. Увіваюцца, высовываюць языке, скачуць зухавата направа і налева і пужаюць селян нейкімі мыфічнымі панамі і князьямі.

На гэта адзін селянін выступіу с прамовай і сказау:

— „...Нас пужаюць панамі і раюць нам ні верыць Вялікай Беларускай Радзе, але я тут ніякіх паноу ні бачу—дзе яны?“

Што датыча нацыянальнай справы, дык усе у вадзін голас кажуць, што *«асыміляцыя -гэта духоуная няволя. Супроціу нацыянальнаго руху ні можа устояць ніякая сіла, дзеля таго, што гэта само жыцце, інстынкт прыроды.»*

І радасна на сэрцы, што беларус чуе і разумеіць, што цяпер нельга чэкаць, ен мае адвагу *бараніць самаго сябе* і выявіць свае нацыянальнае *«Я.»*

Беларус пачау разумець, што самабытнасьць нацыі гэта есьць вялікі скарб у агульна людзкім прагрэсі.

* * *

Вітаемо цябе, Усебеларускі Зьезд! Вітаемо цябе, Народзе Беларускі, праз тваіх выбраннікау з усіх далекіх куткоу нашай многапакутнай бацькаушчыны! Досьць чэкаць чужой апекі—сам, над сваім беларускім сьцягам, куй сваю долю, твары свае шчасьце, будуй сваю будучыню!

Мы спадзяемся, мы пэуны, што ты пачнеш пад родным беларускім сонейкам працаваць на сваю і агульна-людзькую карысьць!

Мы спадзяемся, мы пэуны, што ратаі твае запяюць весьні радасьці на сваіх шнурох, і весяла зажыве Вольная Беларусь!

Хвала табе, Усебеларускі Зьезд! За тваімі плячыма стаіць і чэкае ратунку шмат мільены беларускі народ.

Хвала табе, Беларускі народ!

Хвала табе, Беларускае Войско!

З. Бядуля.

Каля Усебеларускаго Зьезду.

Мінскі горадзкі тэатр ужо быу перапоуняны а $7^1/_2$ гадзіны у вечары. Селянскія сьвіткі і шэрыя салдацкія шынэлі мігацелі усюды. Усе у сьвяточным настрою чэкалі гэтай вялікай містэрыі—адкрыцця зьезду.

А 8-й гадзіні оркестр ваеннай музыкі грау марсельезу. Потым выступіу беларускі хор у нацыянальных вопратках. Над іх галовамі красоваліся беларускія нацыянальныя сьцягі.

Сьпевалі беларускія гімны: «Ад веку мы спалі», «А хто там ідзе» і «Чырвоны знак». Усе слухалі гімны стоючы, без шапак,

Посьля гімнау успаміналі уставаннем усіх барцоу-беларусау, паушых за волю. Потым пайшлі віншаванні ад розных беларускіх і другіх арганізацыяу і суселякіх нацыянальнасьцяу.

Тыя прамовы, што гаварыліся па-беларуску, спатыкаліся селянамі і салдатамі бурнымі апледысмэнтамі і авацыямі.

Выдатны, іскрывы былі нікаторыя прамовы, слухаючы іх шмат хто плакау.

Ад самаго сэрца шчыра вітау прэдстаунік ад украінцау. Кончыу ен сваю прамову такімі гарачымі словамі:

«Вашае горо—нашае горо!
Вашае сьвято—нашае сьвято!»

Быу прэдстаунік ад кубаньскаго казацтва, каторы упэуняу, што кубаньскія казакі зауседы рады дапамогчы беларусам. Тое казу і прэдстаунік ад мусульман

Арганізацыя залезнадар жнікау-беларусау прыслала свайго прэдстауніка, каторы прынес ад іх імені абецанне, што уся тутэйшая зал. дарога дапаможа Вялікай і Вайсковай Беларускім Радам.

Прэдстаунік ад жыдоускаго пролетарыяту вітау зьезд і увесь беларускі народ, кажучы, паміж іншым, што тут, на Беларусі, ніколі жыдоускіх пагромау ні было, што беларускі народ, жыу па-суседзкі с жыдамі і зауседы адносіуся да жыдоу прыхільней, як усе другія народы Расіі.

Выступіу с прамовай прадстаунік ад большэвікоу, нейкі латыш, каторы у канцы свае прамовы прапанавау зняць і знішчыць беларускі нацыянальны штандар, дзеля таго што гэта есьць рэч ніпатрэбная.

Паднялося абурэнне. Выступіу селянін і казау: «Нам ні патрэбны гэткія латышскія вучыцялі». А стары гэнэрал беларус пацалавау беларускі нацыянальны штандар.

Вітанні гаварыліся да 1-ай гадзіні ночы і на заутра да абеду.

З. Б.

Навучэнне роднае мовы у пачатковых школах.

Беларуская мова мае у сабе нешта «уютнае»—цеплае, прыхільнае, як выслоўіцца адзін з добра асьвечных знауцау блізка што усіх славянскіх моваў. І ні дзіво, што людзі гадоу 20 ні гаварыушыя па-беларуску, вяртаюцца да роднай гутаркі і пачынаюць працаваць на яе карысьць і роскві. Навят людзі, што радзіліся на чужыні і з маладых гадоу ні гаварыушыя па-беларуску, а толькі праз жарты часам чуушыя мову сваіх бацькоу, посьля з вялікай любасьцю навучаліся гэтай мові ды рабіліся сьведомымі беларусамі.

Беларуская мова у школах на Беларусі блізка што ніўдзе ні выкладаецца. У нас была школа расійская, цяпер шмат польскіх школ, а беларускіх німа. Ведомы толькі дзьве беларускія школы—адна пачатковая, а другая сярэдняя.

Аднак, цяпер ужо многа хто, нават з ворагоу нашых, прышлоу да пракананыя, што трэба канечне выкладаць і беларускую мову. Паустае пытанне, як увесьці яе у пачатковую школу?

Мы, беларусы, такія бедныя, што да гэтаго часу ні прыдбалі сабе друкованых і добра дапасованых лямэнтароу, хаця і лямэнтары і навят граматыка маюцца у рукапісах. У таком выпадку тэхніку чытання трэба весьці у польскіх школах па лепшых польскіх лямэнтарох, а у расійскіх-па расійскім (напр.: па вельмі добраму лямэнтару Флерова). Тлумачэнне нізразумелых слоу трэба весьці па-беларуску. Адначасьне трэба вучыць з дзяцьмі легкія і пекнейшыя вершы.

Як дзеці ужо навучацца складаць, тагды можна перайсьці да чытання па-беларуску. Дзеля гэтаго трэба перш пазнаёміць дзяцей у польскіх школах з літарамі ч, ж, ш, ў і тагды дзеці адразу пачнуць добра чытаць па-беларуску лацінкаю. Ад лацінкі на трэйцім, або чацьвертум году трэба перайсьці на гражданку.

У Расійскіх школах піхай дзеці навучацца чытаць па-буквару Флерова, напрыклад. Кончыушы буквар, трэба пазнаёміць дзяцей з буквамі дз (адзін зык, а ні два), дж (гэтак само) і ў. Тагды дзеці пачнуць чытаць па-беларуску. На трэйцім, або чацьвертым году, трэба перайсьці на лацінку, каторая прынята усімі культурнымі народамі і каторая вельмі карысная для тых, хто будзе вучыць Эуропейскія мовы.

Адначасьне павінно ісьці так само тлумачэнне расійскіх слоу па-беларуску, вучэнне папамяць пекнейшых беларускіх вершау, чытанне народных казак і сьпяванне беларускіх песьняў.

Што тычыцца беларускаго правопісу, то ен вельмі лёгкі, бо у нас пекі што пішацца так, як гаворыцца, або, як кажуць,—у нас фонэтычны правопіс. Праўда, за апошні час прынято колькі правілау, с фонэтыкай ні саўпадаючых, але іх заусёды легка запамятаць і трымаць на увазі. Праўда, многа підахвату мае наш правопіс, але покі ні апрацован лепшы і адностайны, дык трэба трымацца яго, бо гэтакім правопісам друкуюцца усе нашыя кніжкі і газэты.

А. Д—ч.

Падрахункі вайны.

Вельмі цяжка акуратна падлічыць, ва што абходзіцца ўсесьветная вайна, але на тых матэрьялах, што цяпер маюцца, можна даць больш-меньш пэўныя вось якія падрахункі:

Лік салдатаў розных народаў усяго сьвету даходзіць да *трыдцаці мільенау*. Ва усіх вайнах ўсяго сьвету дагэтуль яшчэ гэткай лічбы ні было.

За ўвесь час вайны забіто 7 мілл. чалав., пакалечано—5 мілл., ранено—14 мілл. Што дня вайны, на працягу гэтых трох гадоў, выпадае забітых—9364, калек—4546, раненых—12726 чалавек.

За тры гады вайны зруйновано 450 гарадоў, знішчэны старасьвецкія памяткі навукі і штукарства. Гістарычныя гмахі, бібліатэкі, музэі нішчыліся без ліку, спалено болей 2000 цэркvoў. А колькі зруйнавано мястэчак,сёл, вёсак і маёнткаў—гэтаго і падлічыць нельга!

Паміж асобнымі гасударствамі можна дзяліць страты вайны гэтакім чынам:

Нямеччына на страчаныя ёю грошы на вайну магла-б скупіць усю бувэльняную прамысловасьць Злучаных Штатаў, усе іх медныя руднікі і усю іх нэфтавую прамысловасьць, а усё-ж такі, апрача гэтаго, яна-б мела яшчэ шмат мільярдаў грошай.

Англія павінна плаціць што год за пазычаныя грошы на вайну працэнты на шмат болей таго заработку, які мае яе гандлёвы флот.

На долю Расіі выпадае забітых—2,250,000, калек—1,625,000, раненых—5,800,000 чалавек.

На долю Англіі, Францыі, Італіі, Бэлгіі забітых — 1,880,000, калек—1,360,000, раненых—4,900,000 чалавек.

На долю Нямеччыны і Аўстра-Вэнгрыі выпадае забітых—3,450,000, калек—1,750,000, раненых—5,900,000 чалавек.

Такім чынам, адна Эўропа страціла забітымі—6,580,000, калек—4,735,000, раненымі—16,200,000.

Трэба яшчэ сюды дадаць, што у ваюючых дзяржавах за тры годы вайны радзін зменшылося на 9 мільёнаў.

За тры годы зроблено ваенных пазычак на 170 мільярдаў рб. Да вайны увесь доўг эўрапейскіх гасударстваў лічыўся усяго 50 мільярдаў. Такім чынам, вайна ужо каштовала чэлавецтву 120 мільярдаў рб.

Расія магла-б на тыя грошы, што ёй каштовала вайна, пакрыць сябе залезнадарожнай сеткай больш густой за бэльгійскую, якая лічылася самай густай сеткай у Эўропі.

Францыя ужо страціла на вайну у два разы болей людзей, чымся усё мужчынскае насяленне Эльзаса і Лётэрынгіі, за якія яна ваюе.

Апрыч таго, нішчыцца гэтулькі залеза, медзі, чугуна, волава, нікеля і другіх металаў, што было-б досіць на выробку сел.-гаспадарскіх прыладаў на цэлое гасударство. Гэтае становішчо служыць глаўнай прычынай разрухі народнай гаспадаркі.

А горш за ўсё тое, што вайна захоплівае ўсё новыя і новыя народы.

Полымя разростаецца і разшыраецца і німа ведама, калі скончыцца гэтае ўсесьветнае нібывалае горо.

Артыкул М. Горкаго.

У нумары 174 «Новой Жизни» выдрукован цікавы артыкул вядомаго расійскаго пісьменніка, М. Горкаго, пра валадыроў сучаснаго становішча у Расіі, большэвікоў. Падаём гэты артыкул у перакладзі амаль ні цалкам:

«Міністры-соцыялісты», — піша М. Горкі: «выпушчаны с Петрапаўлаўскай фортэцыі Лёніным і Троцкім і паехалі да хаты, аставіўшы сваіх сябрукоў па міністэрству—Л. Бернацкаго, А. Коповалова, М. Тэрэшчэнку і іншых пад уладаю людзей, якія ані звання ні уяўляюць сабе таго, што такое—воля асобы, што такое права чалавека.

Лёнін і Троцкі і спачуваючыя ім, ужо атруціліся гнілою атрутаю уласьці, пра вошта сьведчыць іх ганебнае адношэнне да волі слова, асобы, і да усіх тых правоў, за панованне каторых баролася дэмакратыя. Сьляпыя фанатыкі і нісусьветныя авантурнікі, як скруціўшы сабе шыю, бягуць, нібы-то па шляху до *соцыяльнай рэвалюцыі*, а сапраўды—па шляху анархіі, да згінення пралетарыяту і рэвалюцыі.

На гэтум шляху Лёнін і яго таварышы уважаюць мажлівым чыніць уселякія злачынствы, як ось крываўніца пад Петраградам, разгром Масквы, скасованне волі слова, безглуздыя арэшты—уся брыдота, якую чынілі Плеве і Столыпін. Зразумела,—Столыпін і Плеве ішлі проці дэмакратыі, проці усяго жывога і чэснаго у Расіі, а за Лёніным ідзе даволі значная—покі што—частка работнікаў, але я веру, што розум работніцкаго стану, яго разуменне сваіх гістарычных заданняў, хутка адчыняць пролетарыяту вочы на усю хімернасьць абяцанак Леніна, на усю глыбіну яго варьяцтва і яго нечаеўска-бакунінскаго анархізму. Работніцкі стан ні можа ні зразумець, што Ле-

Краю роднаго ні кіну...

Ні паеду я у чужыну,
Краю роднаго ні кіну.
Яго поле, яго нівы
У маем сэрцы родзяцьдзівы,
Што с візначнай уласнай
(сілай
Да краіны роднай, мілай
Мяне крэпка прывязалі.
Я дзіцятко яе жалю,
Яе горкай, нуднай долі.
Ні паеду я ніколі
З свайго краю дарагога.
Ні патрэбна мне нічога.
Сіраціной я радзіуся
С працай цяжкаю зрадніу-
(ся,—
Дык усе жыцце прапрацую
На краіну дарагую.
За работу я у адплату
Маю у весцы піхай хату
І загончык вузкі нівы.
Вось і будзе—я шчасьлівы

Хай у чужыні—кажуць
(людзі—
Многа лепій жыці будзе,
Я на гэта ані дбаю!
Шчасьце лепшае я маю—
Закаханне к сваіму краю,
У яком кожная мясьціна
Мне прыветным словам кіне;
У шумлівум цемнум бору
Птушка міла загавора,
У ручайку вада у мкненню
Разваруша мне натхненне
І абудзе пажаданне
Лепшай долі папавання.
У сваем краю,дзе ні стану,
Усюды сілай ровен пану.
Што пачую, то й адвечу.
Сваю вартасьць чалавечу
Перад кожным ні утаю я.
Не, краіну дарагую
Я да скону ні пакіну—
Тут радзіуся, тут і згіну.

1914. С. П. Б.

Цішка Гартны.

У ноч перад Сьв. Янам.

Блізіцца поўнач. Усё сяло ў цемнаце і сьпіць моцным сном. Толькі ў адзінокай хатцы, там, на канцы вуліцы, трапечацца ў вакне слабенькае сьвятло. Гэта дагарае лучына ў сьветачы; яна адна яшчэ змагаецца з цямнатою і ледзь-ледзь асьветляе той кут хаты, гдзе на скамечанай падушцы, прыкрытая коўдраю, ляжыць хворая кабеціна. У галовах стаіць пахілы стол; каля яго сядзіць бледны, худзенькі сямігадовы хлопчык і задумліва глядзіць на небо. Аблёгшыся на край столу, ён ні рухаецца з мейсца і нічога ні гавора. Толькі, калі хворая час-ад-часу стогне, ён паварочвае да яе галаву і ціхенька пытае:

— Мама, табе вельмі баліць?

— Ох!.. баліць...

Хлапчук ласкава гладзіць матку па твару, прыгаварываючы: «Ні бойся, мама, усё пройдзе!»

Тагды ён павяртае сваю галоўку да неба і зноў глядзіць у яго, як і ўперад. На небі зіхацяць зоркі і бытцым усміхаюцца яму. А ён усё глядзіць на іх і ні можа адарвацца. Адна зорачка затрэпятала, пакацілася і згінула ў цемры ночы, аставіўшы за сабою сьветлую дарожку... Хлопчык глядзіць і усміхаецца, зрадзеўшы.

— Як раз цяпер!—шэпча ён ледзь чутна.

Ен думае, што цяпер пачнуць спадаць і другія зоркі і настане тое, чаго ён цяпер так ніцярпліва чакае. Раніцай гэтаго дня ён гутарыў са сваімі сябрукамі, і адзін з іх сказаў, што заўсёды у поўнач, перад сьв. Янам, расчыняецца небо, і хто усьпея пажадаць сабе чаго-небудзь, покі яно зачыніцца, таго жаданне споўніцца. Усе дзеці гутарылі, што будуць чакаць поўначы.

— Я пажадаю сабе залатога каня,—сказаў адзін.

— Я царскую вопратку!

— Я карэту!

— Я шаблю!

Адзін ён маўчаў.

— А ты чаго хочаш?—запыталі ў яго сябрукі

— Я... я хачу, каб мая мама ачуняла.

І ў яго ні было мацнейшаго жадання.

Бедная яго маці!.. Два месяцы ляжыць і мучаецца. І, апроч яго, нікога німа пры ёй, хто бы мог дагледзіць яе. Толькі суседка Ганна прыходзіць кожную раніцу і прыносіць ім есьці. Таты яго другі ужо год німа. Пайшоў на вайну, і там яго забілі. Прысылаў лісты да хаты, як быў жыў. Але вось аднаго разу доўга ні было ад яго жаднае весткі, аж нарэшці прыйшло паведамленне, што ён забіты. Маці забівалася ад плачу і с таго часу ёй нешта сталося, пачала яна хірэць і ў апошнія два месяцы саўсім захварэла.

І вось хлопчык праз увесь час сядзіць пры століку і глядзіць на небо, ці хутка яно расчыніцца. Заўтра Ян, і сягоння ў ночы яно павінно расчыніцца... Усё сядзіць і абдумывае, у якіх словах выказаць сваё жаданне. Трэба будзе хутка сказаць, а то небо, як бачыш, зачыніцца зноў.

— Божэ, дай мамі здароўья!—гэтак ён скажа. Тагды Бог пэўня што яго пачуе і пашле матцы здароўя, і яна устане с пасьцелі. Ні будзе ужо яна гэткая худая і бледная, і ні будзе ўжо гэткая сумная і задуманая, а будзе такая вясёлая, як і раней, будзе насіць яго на руках, жартаваць з ім і мець яму песяньку:

«Купіць мама Петру боцікі на ножкі,
«Пойдзе мой сыночак праглядаць дарожкі.
«Новую кашульку я табе пашыю,
«У цёплінькай вадзіцы чысьцінька памыю
«Будзеш ты харошы, цётка ні пазнае,
«А чый гэта хлопчык?—«дзядзька запытае.»

Яна будзе, як і перш, яго даглядаць, пашые яму новую вопратку.

— Мама!—ціхінька кліча ён,

— Я... са стогнам адклікаецца хворая.

— Хутка,хутка ты паздаравееш,—кажа ён нісьмела. Але ні кажа ён, як яна выздаравея: ён хоча перш выпрасіць ёй ў Бога здароўья, а тагды ужо, заўтра, як яна абудзіцца зусім здаровая і вясёлая, тагды ён скажа ёй, як ён чакаў, калі расчыніцца небо, і як ён прасіў Бога...

Лучынка дагарае, трашчыць і гасьне. У хаці становіцца страшна цёмна. Маламу робіцца страшна, ён прыгінаецца да століка і яшчэ пільней глядзіць у небо.

— Толькі што зноў стало некалькі зорак; пэўня, хутка небо расчыніцца,—шэпча ён. І хціва глядзіць ён, ці зараз і другія зоркі пагаснуць. А яны зіхацяць і усьміхаюцца, як і перш.

— Божэ, дай мамі здароўья!—паўтарае хлопчык сваю мальбу, каб ні забыцца яе і ні прапусьціць тую хвіліну, калі расчыніцца небо.

— Сьпі!—ціха кажа хворая, пачуўшы, што ён ні сьпіць.

— Сьпі, мама, ты,—тагды і я буду!—адказывае ён.

На вуліцы нехта сьвішча. Гэта начны вартаўнік. На гэты сьвіст на другім канцы вуліцы адклікаюцца сабакі ды зноў усё заціхае.

— Вось цяпер ужо хутка!—шэпча хлопчык і зноў паўтарае сваю мальбу... Ен чуе, як галоўка яго цяжэе і апушчаецца на грудзі, а векі плюшчацца, як налітыя волавам... «Божэ, дай мамі здароўья!» шэпчуць яго вусны, а галоўка ўсё цяжэе і цяжэе... Раптам усе зоркі, быўшыя на небі, негдзя прападаюць. І далёка бытцам нешта разгараецца ўсё ярчэй і ярчэй. Захапіўшы ўсё небо, гэтая сьветласьць кідае праменьні ў маленькую хату, гдзе ляжыць хворая. У хаці становіцца так відно, што хлопчыку аж вочы засьлепляе гэты нівядомы бляск. «Расчынілося небо!» думае ён і шэпча завучаныя ім словы: «Божэ, дай мамі здароўья!» Адразу сьветласьць зьнікае і ў хаці зноў робіцца цёмна... Малыш бачыць, што да яго падходзіць маці, абнімае, песьціць яго, ды такая вясёлая і прыгожая, якою ён помніць яе з часаў, калі быў яшчэ меньшым... Хлопчык ні памятае сябе ад радасьці, цалуе матку і прытуляецца да яе грудзей.

нін на яго скуры, на яго крыві, чыніць дзе-якія толькі спробы, стараецца давесьці рэвалюцыйны настрой пролетарыяту да астатняй магчымасьці і падзівіцца— што с таго выйдзе?

Разумеіцца, ен ні верыць у мажлівасьць перамогі пролетарыяту у Расіі пры сучасных умовах, але, можа быць, ён спадзеіцца на цудо. Работнікі стан павінны знаць, што цудау дапраўды ні бывае, што яго жджэ голад, поўны развал прамысловасьці, разгром транспорту, доўгая крывавая анархія, а за ёю—ні меньш крывавая і страшная рэакцыя.

Дык ось куды вядзе пролетарыят яго сягоняшні повадыр, і трэба зразумець, што Ленін ні усёмагутны ведзьмар, а роўнадушны штукар, які ні шкадуе ані чэсьці, ані жыцця пролетарыяту. Работнікі павінны ні дазволіць авантурнікам і варьятам скідаць на голаў пролетарыяту ганебныя, безглуздыя і крывавыя злачынствы, за якія будзе расплачывацца ні Ленін, а сам пролетарыят.

Я пытаю:

Ці памятае расійская дэмакратыя— за пановане якіх ідэяў яна баролася з дэспотызмам монархіі? Ці уважае яна сябе здольною і цяпер працягваць гэтые змаганне?

Ці памятае яна, што калі жандары Романовых кідалі у турмы і на катаргу ее ідэёвых павадыроў—яна называла гэты кштапт бароцьбы подлым?

Чым-жа розьніцца адносіны Леніна да волі слова ад гэтакіх самых адносін Столыпіна, Плеве і іншых напоўлюдзей?

Ці ні та самая Ленінская улада хапае і цягне у вастрог усіх, хто ні згаджаецца з імі, як гэта рабіла улада Романавых?

Чаму Бернацкі, Коновалоў і іншыя сябрукі каоліцыйнага ураду садзяць у фортэцыі,—хіба яны больш нарабілі злачынства за сваіх таварышоў, каторых вызволіў Ленін?

Ядынаю чеснаю одпаведаю на гэтыя пытанні павінна быць вымога вызволіць міністраў і іншых безвінна арыштованых, а гэтак само адновіць волю, волю слова ва ўсёй яе поўнаце.

БЕЛАРУСУ.

Песьняры: Пауловіч, Колас
І Янка Купала
Усе плачуць, што на сьвеці
Усяго табе мала:
Мала хлеба, зямлі, лесу,
Вады, сенакосу,
Што сьляпы ты, што ні бачыш
Далей свайго носу;
Што ты бедны, абадраны,
У лапцях, альбо босы,
Ні памыты, ні чэсаны
І проставалосы;
Што працуеш ты усе жыцце,
Карысьці ні маеш,
Што за працу ні ад кога
Падзякі ні знаеш;
Што тагды ты адпачынеш,
Як працягнеш ногі,
Што ніхто табе да сьвету
Ні дае дарогі;
Што заўседы ты гаруеш,
Сьлязьмі горка плачаш,
І што нават на вяселлі
Ні пяеш, ні скачаш;
Што ніколі ты ні маеш
Прасьветлай гадзіны,
Што жывеш на гэтым сьвеці
Горай ад скаціны;
Што ты добры, справядлівы,—
Пакорны век—векам
І што хочаш, каб лічылі
Цябе чалавекам;
Што ты жджэш, калі засьвеціць
У тваей старонцы
Цераз тыя чорны хмары
Ласкавае сонцо.
Можа усе гэта і праўда,—
Але мне здаецца,
Што ні так уже маркотна
Табе там жывецца;
Што часамі ты бываеш
Нават і вясёлы
І працуеш, мой ты браце,
Менай ад жывёлы.
Прыдзе сьвято, пойдзеш зрана
Богу памаліцца,
Ды і думаеш у церкві,
Каб скарэй напіцца;
З церкві проста, без аглядкі,
К Залману, чы Бэрку
Прыбяжыш і хутка лыкнеш
Гарэлкі кватэрку.
Закусіўшы, чым папало,—
(Ну, хоць хлебам з лекам),
Цэлы дзень пяеш, гуляеш,
Ходзіш абібокам.
А як здарыцца вяселля,
Пьеш, ясі, спаваеш,
А там, вышаўшы із хаты,
У калэ згуляеш.
Без калоу, без мордабою
Гэта ні вяселля,
Усе роўна як часамі
Пьянство без пахмелля.
А у хляве, чы пад печкай,
Як што завядзецца,—
Ну, дык з ім скарэй на рынак
Гаспадар наш прэцца.
З рынку едучы да хаты,
Шынкоу ні мінае;
Як вярнуўся, дык ніколі
Сам ні памятае.
Расчыніўшы ляпу, пьяны,
Лежачы на возе,
Крычыць усім: «Пашоу к чорту,
Ні стой на дарозе»!
Вот чаму ты, мой ты браце,
Голы, абадраны,
Ні памыты, ні абуты
І ні прычэсаны:
Што ты многа пьеш, гуляеш,
Дабра ні шануеш,
Хоць у цэркау рэдка ходзіш,
Але шмат сьвяткуеш...
Што ты кніжкі, чы газэты
Вельмі ні уважаеш,
Што ты Залманау і Бэрак
Натта многа знаеш...

Антось Кабер.

ПА БЕЛАРУСІ.

(АД НАШЫХ ДАПІСЧЫКАУ).

М-ко Крайск, Віленск. губ. У мастэчку хутка посьля таго, як настала свабода, была заложана хаўрусная крама. Селяне ахвотна прылучаліся да хаўрусу, уносячы нават досыць вялікія грошы. Справа пайшла добра, так што крама на пачатку вела, па даручэнню сходу, работу спажыўчай мейсцовай Управы, але посьля, як выбраны быў спажыўчы урад асобна, то кіраўнікі крамы ніяк ні маглі падзяліць паміж сабою рахункі управы і крамы, і шмат селян пачалі браць свае ўзносы назад. Але дзякуючы мейсцоваму фэльчару Новіку, каторы, старанна завінуўшыся каля гэтае справы і параіўшыся з адным гарадзкім чалавекам, падаў устаў на зацьвярджэнне, і заклад чыкі назвалі гэты каопэратыў «Радасьць». На установучым сходзі быў абраны урад, каторы, як відаць, пачаў працаваць на радасьць грамадзян, што дай Божэ і шчасьці Божэ.

Вельмі было-б пажаданым, каб гэтакая радасьць пашыралася скрозь па нашай бацькаўшчыні Беларусі, бо ў еднасьці сіла, дарога да асьветы і культуры роднаго краю.

Праезды.

Парафіяноўская валасьць, Вілейск павету. 29-го кастрычніка у нашай воласьці адбыліся выбары гласных у волостное земство. Былі выстаўлены два кандзідацкія спіскі; адзін састаўляўся у воласьці, а другі Пархвеноўскім ксяндзом Шырокім. Як ксёндз ні стараўся, нават з амбоны прасіў галосаваць за яго сьпісак № 2, але людзі ні слухалі і больш кідалі за свой спісак № 1. Праўда, і у іх спіску былі людзі, каторыя нівядома як папалі туды, хто іх запісаў, але усё-ж такі спісак № 1 перамог № 2, і па першаму спіску прайшло 41 ч. гласных, а па ксяндзоўскаму спіску—9.

Да самых выбароў селяне ані ні цікавіліся ні земствам, ні выбарамі у яго, а у дзень выбароў як-бы праснуліся і сталі пытацца, гаманіць,—што, як і чаму яны нічога ні ведаюць. Ім казалі, а чаму-ж вы ні йшлі на сход, як вас прасілі, дзе тлумачылі, прыехаўшыя з Вілейкі людзі. Але усё такі выбары прайшлі. Кажуць, што у Пархвенаўскім участку [воласьць была разьбіта на 4 уч.] кідалі запіскі і за тых, што дома былі. Селяне гэтаго участку амаль усе каталікі.

Язэп Адзінокі.

г. Смаленск. Большэвіцкае поўстанне ў Петраградзі адгукнулася і у Смаленску. На другі дзень посьля поўстання залажыўся гэтта камітэт грамадзянскай абезпечнасьці, каторы, маючы за сабою казакоў, пайшоў проціў большэвікоў, абвясьціўшых сябе ядынай уладай ў горадзі. Казакі павелі аблогу губэрнаторскаго дому, у каторым заселі большэвікі і пачалі стрэляць з вінтовак. Большэвіцкім воякам, ні гледзючы на тое, што у іх былі кулямёты, прышлося-б кепска, каб ні ўспадзеўкі для камітэту ні выступіла проці яго артылерыя, якая пачала стрэляць з гармат у Думу, дзе сядзеў камітэт, і гэтым рашылі справу на карысьць большэвікоў. Камітэт зышоў с пляцу бою, казакі здаліся на літасьць дужэйшаго і злажылі аружжо, а большэвіцкі «Совѣтъ» узяў гару. Але улада злажылася усё-ж такі каоліцыйная,—з большэвікоў, эсэроў, с.-д., бо большэвікі, мабыць, ні чуліся у сілі. Стрэляніна пашкодзіла толькі горадз. Думі, якой бомбай прабіты дах і кулямі павыбіваты шыбы у вокнах, а так само нізначная шкода зробляна і губэрнатарскаму дому. Кажуць, што людзей пацярпело каля 100 чалав. і у тым ліку 5 чалав. забітых. Цяпер у горадзі ціха. Новая улада мусі пачувае сябе кепска, бо усе выглядаюць, як мухі у восянь.

За тое украінцы, палякі, латышы, літоўцы—жывуць. Выставілі пад № 5 свой спісак кандыдатаў да Установучаго Сойму па Смаленшчыні. У адозвах да грамадзянства кажуць, што яны будуць дамагацца фэдэрацыйнаго ладу у Расійскай Рэспубліцы і трымацца пастановаў зьезду народаў у Кіеві.

А тутэйшыя беларусы жывуць, як набяжыць, і працуюць, як мокрае гарыць. У свой час была заложана арганізацыя с 4 сотнямі сябрукоў, але ад нірухомасьці распаўзлася. Вэенных, каторых было найбольш, начальство паразсылало то у камандзіроўкі, то на фронт, а рэшта ні ужылася разам па прычыні рожніцы. Пісар прыказаў Альжбеці пазьбіраць разьбітае шкло з ваконца, а сам паціхіньку адвеў руку жончыну ад носа ды стаў весяла разказваць, як разправіўся с Цімохам з Засады. А што нос у пісарчы зрабіўся як тоупяк, то таго і ні прыкмеціў пісар. Дзеля гэтаго жонка ні вельмі слухала яго і ні хваліла двулікай палітыкі мужа.

* * *

Ужо даўно разсьвітало, калі хлопчык абудзіўся. Расчыніў ён вочы, працёр іх і азірнуўся кругом сябе. Прыпамятаўся яму той сьветлы прамень і як ён маліў Бога за маму. Ціхінька ён устаў і паглядзеў на пасьцель: «Можа, мама ўжо ўстала!» ледзь чутна шапнуў ёй, падыйшоў да ложка і нахіліўся над маткаю. Яна лежала, спакойная, бледна-жоўтая.

— Сьпіць!—прашаптаў бедны хлопчык.

Ен хацеў расказаць мацяры, як ён усьпеў выказаць сваё жаданне, пакуль небо было адчынено.

— Мама!—клікнуў ён ціхінька.

Ява ні адклікалася.

— Мама!.. Сьпіць! прашаптаў хлопчык.

Ен адыйшоўся крыху далей і стаў чакаць, калі матка прачнецца. У гэты час увайшла суседка Ганна. Уходзячы, яна ціхінька стукнула дзьвярмі. Хлопчык палажыў паляц на вусны і прашаптаў:

— Мама сьпіць!

Суседка застанавілася, глянула на хворую, падбегла да яе і ухапіла за руку. Рука была халодная. У Ганны вочы заплылі сьлязьмі, хацела яна крыкнуць, але глянула на дзіця і устрымалася.

— Сьпіць!—сказала яна і, павярнуўшысь да хлопчыка, ўзяла яго за руку:—Пойдзем да мяне, пакуль яна прачнецца!

— Пойдзем!—адказаў ён ні зразу:—Толькі ціхінька выйдзем, каб мамы ні разбудзіць.

І ён пайшоў на пальчыках. Калі ён быў ужо ў дзьверах, агляпуўся, зноў падыйшоў да маткі і ціха пацалаваў яе бледную руку, зьвісшую з ложка.

— Сьпі, мамка!.. Я ні буду цябе будзіць!—І выйшлі з хаты...

Язэп Шпэт.

З Бэрштоускай пушчы.

Гадоу тры таму назад, у сераду перад Валосяй, небо пакрылі шэрыя хмаркі. Позна у вечар навокала было цемна і ціха, ціха...

Ажно каля поуначы, ля кватэры лесьнянскаго воласнога пісара, хтосьці, пераводзячы дух, прагаварыу: «Ніхай цябе с козьлікам, як я утаміуся! А яшчэ ніведама, што з гэтаго будзе.» Потым чуваць было, што нехта асьцярожне стукнуу у дзьверы пісаравай кватэры і, бадай, на голас пісара ні сьмела адказау:

— Гэта я—Цімох з Засады,—адчынеце, паночку!

— «Глядзі, каб мне больш гэтаго ні было!» быццым сярдзіта сказау пісар.—«Што гэта за установа тут, што ні днем, ні у ночы ад вас, як ад сьляпнеу тых, ніяк ні адабьешся?!» І адчыніу адну палавіцу дзьвярэй.

— Не, паночку,—адчыняйце абедзьвы палавіцы, бо мы ва двойгу і ні войдземо разам! –з усьмешкаю працягнуу Цімох.

Гэта зацікавіло пісара. Адчыніу ен другую палавіцу дзьвярэй. Узяу вус у рот і думае: «С кім Цімох у двойгу?» Увайшоушы у пакой, пісар борздзінька чыркнуу серпічку, запаліу сьвечку ды зірць на Цімоха. А Цімох у той час развязвау мяшка, каб выцягнуць казла з яго.

— А што,—можа грыбкоу прынес мне дзеля сьвята? ласкава спытау пісар Цімоха.

— Не, дзе цяпер знойдзеш тых грыбоу? Гэта я упалевау козьліка пану-пісару. Бачыце, калі аддзяліу мяне Якуб, нічога ні даушы мне бацькаваго, то я ні мог спярпець вялікай крыуды і на васеннія дзяды такі добра вылаяу яго перед людзьмі. Ну, ен і падау на мяне у воласьць...

— А ведаеш тэнгаго застрэліу ты козьліка, Цімох!—сказау пісар і пагладзіу казла па хвасьце.— «Але як сьмеу ты яго забіць? Га?! З мяне вы бярэце прыклад—га?! Та я ж з самым лясьнічым за панібрата... Я хаджу на палеванне у пушчу, за тое без мае працы ні водзін лясьнік ні пападзе на службу. Скажы, ты што добраго зрабіу лясьнічаму?

— Паночку, я-я-я...

— Ага, цяпер «я-я!» Вось я навучу цябе, вужу ты пякельны, як зводзіць дзіч у царовай пушчы Бэршгоускай!

Раптам адчыніу пісар кухню ды кліча: —«Альжбета, Альжбета! Хутчэй бяжы па вурадніка,—ніхай ідзе саставіць пратакол на гэтаго філіганта.»

Цімох задрыжэу, як асовы ліст, і—са сьлязьмі да пісара: «А паночку, а даражэнькі! Як у Бога верыце,—злітуйцеся, пашкадуйце маіх блазнотак, жонку хворую! Ні пасылайце толькі за вураднікам,—я ад вас нічога ні хочу!..

Каб ні бачыу Цімох, пісар адвярнууся, злосна пасьміхнууся, а потым як закрычыць: «Вон, гад, ты гэтакі,—глядзі, каб і духу твайго тут ні было!»

Брыдка і жудасна стало Цімоху, але ен рад быу такому канцу. А пісар, ходзячы па пакою, гаварыу сам да сябе: «Іначай з гэтым быдлам нічога ні зробіш. Ты ніколі ні паказвай яму, што ен табе ласку зрабіу, бо дасьць на грош, а будзе валачыцца, «як аняце за пасталом.» Не, мала гэтаго,—яшчэ трэба ведаць, што-коляк больш. Трэба точку абмяркаваць, трэба запятую умець паставіць. Без гэтаго—прапау чалавек!».

Пісарча так само ні спала: ей штосьці карцело. Злезла яна з ложка, стала ля дзьвярэй і давай падслухваць праз ваконцо размову пісара с Цімохам. Пісар гэтаго ні ведаючы, як шмаргане з радасьці дзьверы у спальню ды вакенцам у нос пісарчы. Пісарча малапкаю апынілася на ложку; згарнулася у клубок і ляжыць, дзержачыся за нос рукою, нібыта й ні лыхая. Пісар прыказау Альжбеці пазьбіраць разьбітае шкло з ваконца, а сам паціхіньку адвеу руку жончыну ад носа ды стау весяла разказваць, як разправіуся с Цімохам з Засады. А што нос у пісарчы зрабіуся як тоупяк, то таго і ні прыкмеціу пісар. Дзеля гэтаго жонка ні вельмі слухала яго і ні хваліла двулікай палітыкі мужа.

— Дзе-ж ты вочы падзенеш? Ты-ж меу дзело с Цімохавым братам,—яны цябе падвесьці могуць.

— Хто,—гэтае быдло?! Каб я большаго страху ні бачыу! Ты-ж помніш, калі старшыня за узлом властной касы дастау арыштанскія роты...

— А-а-а!..

— Ты зноу аб маентку? Та я-ж табе казау, што гэты маентак нам ні падходзіць. Нам, калі купляць, то ні за дваццаць, а за сорак тысяч рублеу... Дзякаваць Богу, есьць што земскаму падарыць. Зноу будзе безпечне на месяц які-другі, бо тлусты і агромадны козьлік!

— Ну, добра,—а што-ж ты зробіш з Цімохам ды з Якубам?

— Э-э, каб мне іх больш траплялося! Разбор дзела іх вазначу у палавіні марца, калі скоціцца болька Якубу с сэрца, ды астаулю без наследцтва.

Хутка прышла і палова марца. Роуна а дзісятай гадзіні зрання прэдседацяль адчыніу суд. Воластны пісар, Пятрук Блашчыца (так празвалі яго за тое, што ен, як блошчыца, смактау кроу с кожнаго селяніна) прачытау: «Дзело № 1 па абвінавачэнню Якубам Замосьцянскім роднаго брата Цімоха Замосьцянскаго за учыненае пры людзях зневажэнне словамі». Потым стау выклікаць сьведкау. Але нікаторых сьведкау яшчэ зусім ні было, а другія пайшлі да Боруха бутэльку лясиуць. Цімох быу бедны і сьведкау ні меу.

Далей прэдседацяль запытау братоу, ці ні памірацца яны і, адтрымаушы адказ, апросіу, ці ні мае Якуб чаго дабавіць да жальбы; ці ні лічыць сябе Цімох віновайцай. Абодвы браты моучалі. Прэдседацяль пераглянууся з судзьямі ды выйшоу з імі у «совѣщательную».

Ні за доугім часам вярнуліся судзьі і селі на свае мейсцы. Пісар дау ім расьпісацца у некуй тоустуй кнізі. Потым прэдседацяль папрасіу усіх устаць. а пісар прачытау: «Лесьнянскі Воластны Суд, у поуным сваем зборы, разгледзіушы справу па абвінавачэнню Якубам Замосьцянскім брата Цімоха Замосьцянскаго за зьневагу словамі, пастановіу: справу Замосьцянскіх прызнаць без наследцтва за нідаказаннасьцю. Пастаноуленне суда акончацяльнае».

— Якуб і Цімох Замосьцянскія,—патурбуйцеса расьпісацца!..

Кажуць, што у карчмі, звячоркам, Якуб, падвіпіушы, цалуючыся с Цімохам, прызнавауся яму, што дау Блашчыцы паусотні, каб за ім пакеравау справу, але Цімох пра козьліка нікому нічога ні сказау.

Сліжэвіч.

цы ў поглядах на зямельнае пытанне, а, галоўным чынам, баючыся «польскай інтрыгі» у беларускім руху (!). Звычайная зьява сярод беларусаў: абы вышлі-сь 2-3 беларусы разам—дык зараз пачынаюцца спрэчкі аб мові і дакоры усялякімі інтрыгамі. Адзін ягомасьць, напрыклад, чалавек вышэйшае асьветы, налічыў у беларусаў цэлых 12 гаворак і заблудзіў бедак сярод іх. Гукаў, гукаў у гэтай таемнай гушчарні праз увесь час рэвалюцыі ды так і супакоіўся, махнуўшы на усё рукою. Паслухаць яго, дык у беларускага народу свае мовы німа, а ёсьць гаворкі: радзівілоўская, скірмунцкая і т. д.,—колькі магнатаў, столькі і гаворак. І тро' было гэтаму бедаку турбаваць сваю «прамудрую» голаў унівэрсітэцкімі дысцыплінамі, каб зрабіць такі ярлашь у сваёй гаротнай галаве! Другі тутэйшы беларус цераз «ѣ» напісаў праграму па гісторыі Беларускага народу, у якой паміж іншымі маецца такі артыкул: «Бѣлоляхі. Положеніе порабощенныхъ бѣлорусскихъ людей на польскія средства». Усюды і скрозь «польская інтрыга»! Шкода нам гэтых людзей, шчырых вучняў маскоўскага царызму!..

Ні гледзючы на гэта, дзе-хто з асобных беларусаў працуюць, як могуць. Адзін педагог напісаў школьны падручнік па гісторыі Беларусі на расійскай мові, дадаўшы да яго добра зробляную карту Беларусі. Падручнік ужо пайшоў да друку і мае выйсьці у г. Могілёві. Той жа самы аўтор працуе ціпер над слоўнікам беларускім. Шчасьць Божа! Нам патрэбныя кніжкі. Ніхай пішуць іх на якой хочуць мові, абы праўда і шчырая любасьць да бацькаўшчыны водзіла іх рукою.

Другія нашыя землякі працуюць над пашырэннем і паглыбленнем нацыянальнай сьведомасьці ды клапоцяца аб тым, каб зноў утварыць тут беларускую арганізацыю. На 17-е лістапада назначан быў сход беларусаў Смаленшчыны. Прадстаўнікоў Беларускае Вайсковае Рады сустрачалі з вялікай зычлівасьцю, і заданні Вайсковае Рады стрэлі прыхільнасьць з боку начальніка мінскаго ваеннага акругу ген. Лешы, які, у прыватнай гутарцы с тутэйшымі украінцамі, прызнаў сябе за беларуса.

Нашай настаўніцкай сэмінарыі з Маладэчны, якая часова прымысьцілася у мейсцовай гімназіі Вароніна, пагражае нібезпечасьць: яна можа перасунуцца яшчэ далей ад Беларусі, на Маскоўшчыну. Трэба, каб нашая Вялікая Рада вярнула яе да дому.

Драбніца: усе тутэйшыя інтэлігэнтныя беларусы, відаць, шчырыя патрыоты, але у гутарках ні ужываюць роднае мовы.

Воладзюк.

Варьяты. Селяне Віцебскай губ. паслалі у Петраград дэлегацыю шукаць правасудзьдзя. Справа у тым, што селяне трох суседніх вёсак захапілі у траўні сялібу валічнёю у 18 дзесяцін некага пана Новакоўскага, але падзяліць не да гэтага часу ні маглі. Пашлі сваркі і пабоішчы. У рэзультаці—за 18 дзесяцін зямлі 14 чалавек забіто, 36 чалав. пакалечана, не веі і 70 чал. проста зранены, ні лічучы ужо матэрыяльных страт для усіх трох вёсак. Рабілася гэта у Невельскім павеці на Віцебшчыні. Кажуць, што ні знайшоўшы сабе парады у Петраградзі, дэлегацыя пашыбавала у Стаўку. Ну, ці ні варьяты гэта?!

Беларускае войско. Мінск губ. 10-го лістападу вярнулася с Стаўкі дэлегацыя Беларускай Вайсковай Рады. У Стаўцы дэпутацыі выказалі прынцыпіяльную згоду на арганізацыю Беларускіх войск. Вайсковая Рада прыступае да арганізацыі у Мінску беларускіх палкоў дзеля абароны грамадзкага парадку у горадзі і яго ваколіцах. Ужо арганізованы два беларускіх батальёны.

Німа гаспадара. [З вёскі Вілейск. пав.] Прышла хмурая сумная восень. Аслабаніліся дзеці ад селянскіх работ і трэба б было ісьці у школу вучыцца, але бяда, што дагэтуль на вёсках школ ні адчыняюць. Гэта сталося вось з якой прычыны.

У нашым павеці было шмат царкоўна-прыходзкіх школ, каторымі да рэвалюцыі кіравало праваслаўнае духавенства. Хоць навука у гэтых школках ішла натта дрэнна, але ўсё ж такі дзеці там вучыліся. Ціпер, с пераходам гэтых школ пад загад міністэрства народнай прасьветы, да гэтаго часу адбываецца перадача школ ад адных да другіх. і покуль што німа пэўнаго гаспадара. А тым часам, дзеці у вёсках марнуюць залаты час, ні маючы дзе вучыцца. А каля фронту, напрыклад, дык ужо трэці год, як пазачыняты усе школы, і німа каму падбаць аб тым, каб даць прасьвету дзецям, каб вярнуць малым нівінным дзецям іх духоўную страву, бо потым ужо будзе позна. Аб гэтым трэба паруціцца самым селянам. Німа чаго моўчкі сядзець ды чакаць, пекі за іх хто зробіць. Час ні чакае, трэба варушыцца!

С. Б—ч.

Вёска Мачынаўшчына. Вілейск. пав. Дачка гаспадыні, у якой я стаяў на кватэры, ціха, каб ніхто ні пачуў з маіх таварышаў, сказала мне: «Ведаеце, якую я вам навіну скажу: ужо ксяндзы, так само, як і вы,—беларусы.» Пытаюся, як гэта так? А яна адказала, што у іх парахвіі быў біскуп. Дзяўчаты хадзілі і казалі, што ксяндзы пры біскупу гаварылі навукі «па-просту,» тлумачучы, што гэта мова—беларуская. У вёсцы рады, што да іх прамоўлялі у касьцелі на зразумелай мові.

Вілейскі.

Пагром маёнткаў. З Магілёва паведамляюць, што ў Чорнаруцкай воласьці, Магілёўскага павету, селяне разграмілі амаль ні усе панскія маёнткі. Разгромлены — Чукі, Бабчын, Маецыянаво, Адэлькаво, Чорнаручча, Езеры і інш. Хатнія прылады, рэчы і усё, што нападаецца пад кулак або тапор, пагромшчыкі ломяць і псуюць, скаціну дзеляць паміж сабою, але аб зьнішчэнні маентнасьці агнём ні чуваць было.

Пагромы у паветах. З Новагрудшчыны паведамляюць, што салдаты разграмілі маёнтак Замірье і хвальб. Сацкая-Ліпка. Знішчан увесь жывы і мёртвы інвентар і маентнасьць. Разгромлены гэтак само маёнт. Уша кн. Сьвятаполк-Мірскаго. Заграбована уся скаціна, коні і хатняе птаство.

У Бабруйскім павеці селяне забіраюць лес, загатованы Земскім Саюзом. Апошнімі днямі крадзеж прыняў масовы характар. Ужытыя заходы проці грабункаў ні дасягаюць мэты,—ніхто нікога ні слухае

Беларускія курсы. У Мінску адчыняюцца курсы беларускае мовы, пісьменства, гісторыі і географіі. Курсы будуць безплатныя. Запіс на курсы і справункі штодзенна ад 12—6 гадзін дня у памешканню В. Бел. Рады (дом б. губэрнатора, Пляц Свабоды).

Курсы для агуловай люднасьці будуць цікавыя тым, што гэта у першы раз пазнаёміць слухачоў з беларускім народам і дасьць патрэбнае разуменне мэтаў і заданняў істнуючых беларускіх арганізацыяў, каторыя бяруць свой пачатак з часоў Рэчы Поспалітай. А для беларусаў—курсы будуць і першаю школаю для азнаемлення с сваім краем.

Скольки лесу на Чарнігаўшчыні. Па афіцыяльным ведамосьцям з лесоваго дэпартамэнту, на Чарнігаўшчыні рахуецца лесу:

У Чарнігаўскім	павеці	29,331	дзест.
„ Борзенскім	„	7,693	„
„ Глухоўскім	„	40.221	„
„ Гараднянскім	„	68,531	„
„ Козелецкім	„	14,182	„
„ Конатопскім	„	8,645	„
„ Кролевецкім	„	32,569	„
„ Мглінскім	„	80,336	„
„ Новг.--Северскім	„	80,902	„
„ Новазыбкоўскім	„	65,522	„
„ Нежынскім	„	14,311	„
„ Осцерскім	„	82,840	„
„ Соспіцкім	„	79,161	„
„ Стародубскім	„	34,427	„

Процэнт лесовасьці на Чарнігаўшчыні—14,4.

Пратакол.

першаго арганізацыйнаго сабрання Дрысенскіх беларусаў.

24 лістападу 1917 году. За старшыню выбраны Сушынскі, а пісарам Косінскі.

Сушынскі, адчыняючы сход, знаходзіць патрэбным, каб беларусы організаваліся у мейсцовы беларускі дэмакратычны рэвалюцыйны камітэт, каторы вайшоў-бы у стычнасьць з Вялікай Беларускай Радай, узяўшай на сябе мэту зарганізаваць увесь беларускі народ. Азнаёміў сход з гісторыей Беларусі, з яе магутнай славай і упадкам. Беларусь развілася нізалежна ад Масквы і маець сваю гісторыю і сваю культуру, свае мейсцовыя эконамічныя асаблівасьці, праз гэта маець права на самадзейное аўтаномнае жыццё у Фэдэратыўнай Расійскай Рэспубліцэ. Разьвіццё нацыянальнаго пачуцця і дэмакратычнаго нацыянальнаго руху з яго арганізацыей ні можэ быць шкадлівым для агульна-Расійскаго дэмакратычнаго руху. Затым была дaложана рэзалюцыя зьезду беларусаў воінаў заходняго фронту і прэдстаўнікоў беларускіх арганізацый XII арміі, Балтыцкаго флоту і Румынскаго фронту ад 18-24 кастрычніка 1917 году у Мінску. Посьля гэтаго запропанаваў арганізаваць Дрысенскі беларускі рэвалюцыйны камітэт на пляцформі вышэй памянёнай рэзалюцыі.

Чэркас сказаў: Хоць беларусаў с пачатку палякі, а посьля маскалі хацелі перарабіць на свой лад, але гэта нашым ворагам ні удалося. Беларус астаўся беларусам і ні страціў асаблівасьці свае мовы і свае самабытнасьці. І хоць казалі, што німа беларусаў і с самой Беларусі, а тым часам, навят самадзяржаўнае царскае правіцельство напісало асобны кодэкс законаў для Беларусі,—значыць, і ён лічыўся с самабытнасьцю Беларусі, страціўшы надзею пахаваць яе. Цяпер жа, калі уся дэмакратыя змагаецца за самакіраванне нацыянальнасьцяў, беларусы мусяць прачхнуцца і арганізавацца, дзеля абароны свае бацькаўшчыны і адбудавання нацыянальнай культуры.

Сушынскі прапануець запісацца у члены Камітэту на сацыяльнай пляцформі рэзалюцыі зьезду воінаў-беларусаў.

Сход, посьля абмена паглядамі, пастанавіў: арганізаваць у Дрысе беларускі рэвалюцыйны камітэт і выбраць выканаўчы часовы урад з пяці чалавек. Патаёмным голасаваннем выбраны: за старшыню Язэп Сушынскі, яго таварышамі: Барыс Цяста і Паўлюк Чэркас, скарбнікам—Сымон Тарасаў [сын], пісарам—Антось Касінскі.

Старшыня Сушынскі лічыць патрэбным даць інструкцыі выбранаму ураду: 1) паведаміць Вялікую Беларускую Раду аб адчыненым у Дрысе камітэці; 2) прасіць Раду даць інструкцыю, каторую камітэт на мейсцы праводзіў бы у жыццё; 3) паруціцца аб павялічэнню лічбы членаў камітэту; 4) прыгарнуць да працы камітэту як можна больш інтэлігэнтных мейсцовых дэмакратычных сіл; 5) пры запісі членаў мець на увазі прынятую палітычна-соцыяльную пляцформу; 6) выпісаць усе беларускія газэты: «Вольную Беларусь,» «Крыніцу» і др. 7) уступны ўзнос адзін рубель.

Прапазыцыя Сушынскаго прынята усімі.

Да вучняу беларсау!

Дзень разсьветляецца, цемень спаузае,
Процьма радзея, дарогу дае;
Ранняя зорка сьвяціць пачынае,
Сонцо устае.

Апосьля доўгаго сну, прачніцеся, таварышы вучні-беларусы, паглядзеце, што робіцца каля вас!

Усе арганізуюцца, усе працуюць на карысьць свайго народу. Адны мы, беларусы, як бы нічога ні чуем, як бы спімо.

Мы клічам вас!

Закладайце гурткі «Таварыства Прасьветы» пры сваіх школах. або арганізуйцеся на мейсцох у адну «Беларускую Вучнёўскую Грамаду», каб падняць нацыянальную самасьвядомасьць паміж народу, каб памагчы яму у яго цяжкай долі, каб сказаць яму: «і мы, братка, с табою!»

Наша Мінская Вучнёўская Грамада, злучаючы усіх вучняў-беларусаў сярэдніх і вышэйшых пачатковых школ гораду, мае сваім першым заданнем ствараць с самых сябе тую працоўную інтэлігэнцыю, каторая аддала-б усе свае сілы на карысьць роднага народу нашай бацькаўшчыны-Беларусі, каб павесьці яе да новага культурнаго і гістарычнаго жыцця, вялікаго і слаўнаго!

Урганізуйцеся, таварышы, і прысылайце весткі аб гэтым да нас, каб мы апосьля мелі магчымасьць склікаць зьезд вучняў-беларусаў.

Мінская Беларуская Вучнеўская Грамада.

г. Мінск, Пляц Свабоды, д. Вялікай Рады.

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

Выпуск украінскіх грошай.

Ген. сэкрэтарство фінансаў разам с прэдстаўнікамі кіеўскіх урадных і прыватных крэдытных устаноў рэшыло выпускаць украінскія грошавыя знакі.

Крэдыткі маюць быць абезпечэны вось якімі фондамі: 1) прыбыткі земстваў і гарадоў Украіны, 2) цукер і 3) працэнтныя паперы. Пры сэкрэтарыяці асобая камісія сьпешна апрацовывае законапроэкт, як забезпечыць украінскія грошавыя знакі адным с паказаных фондаў.

Ген. сэкрэтарыятам запрошаны спэцыялісты друкары бонаў. На малюнак для бонаў абвешчаецца конкурс. Першая сэрыя бонаў дробнай вартасьці выйдзе з друку праз 10—12 дзён.

Формараванне украінскаго войску.

Прыказам па одэскай ваеннай акрузі гэн. сэкрэтар С. В. Петлюра абьявіў прыступіць да формаравання 1-й украінскай лёгкай батарэі і гайдамацкіх курэнёў с 3-х батальёнаў у Елісаветградзе, Александроўску, Хэрсоні, Бірзулі, Крывым-Розі і Тыраспалі. Одэская авацыонная школа зроблена украінскай школай. Формаруюцца так сама 1-й і 2-й украінскія авацыонныя атрады.

Палякі і падзеі.

Польская рада у Петраградзі заявіла, што польскаму войску ні трэба умешывацца у расійскія сваркі. Польскія салдаты—вольныя грамадзяне Польшчы і ні павінны прылучацца да між усобнай вайны у Расіі.

АХВЯРЫ

на фонд «Вольнае Беларусі»

К. Душэўскі 3 рб; А Душэўская 2 рб.; С. Высоцкі 1 рб. 15 к.; Л Позняк 1 рб.; П. Каравайчык 1 рб. 35 к.; К Метла 75 к; М. Пятушок 50 кап.; П. Мацько 1 рб.; А. Матkоўская 5 рб. А. Амбрушкевічанка 25 к.; Бохонько 40 рб.; В. Ж.-6 рб.; Бездзецкі 3 рб.: Барташевіч І. 10 рб.; Вакульчык—2 рб. У. Фальскі 15 рб.;

На Бел. Нац. Фонд.

Ад N праз Э Будзько—5 рб.; Барташевіча І. 10 рб.; прапр. Кавпак—5 рб. Казак 3 рб.

На фонд Беларускае Школы.

Манькоўскі 2 рб.;

Рэдактар Я. Лёсік.

Аддзел Прасьветы пры Гарадзкой Управі абвешчае,

Што **с 4-го сьнежня** (декабря) гэтаго году **ад 2—5 гадзіны** у дзень будуць прымацца дзеці беларусы у нова адчыненыя школьныя камплекты 1) пры 9-й школі на **Н. Ляхоўцы у домі № 8 Фрэнкеля** і 2) пры 5-й школі на **Каломенскай вул. у д. № 38 Жывіцкаго.**

Аддзел Прасьветы.

«Т-во Беларускай Культуры.»

Друкарня Я. А. Грынблята.